УЛАДЗІСЛАЎ ГАРБАЦКІ

# Якая культура, такая і палітыка

## З нагоды сьмерці Ірыны Бугровай

Адно зрэдчас беларуская палітычная навука дасьледуе, а тым больш тлумачыць палітычнае праз прызму культуры. Да такой рэдкай і непаўторнай катэгорыі дасьледнікаў належала паліталягіня Ірына Бугрова, якая доўга ходаючыся з страшнай і невылечнай хваробай памерла ў Менску 6 сьнежня 2011 г.

Здаецца, як банальна — тлумачыць палітыку культурай. Здаецца, гэта, так бы мовіць, «лёгкая паліталёгія» ў параўнаньні з «цяжкай» ці «жорсткай» палітычнай аналітыкай выбараў ці палітычным прагназаваньнем. Насамрэч, без асновы — бязь веданьня пэўных традыцыяў, палітычных і сацыяльных завядзёнак, працэсаў, здабыткаў, а таксама траўмаў народу ў мінулым далёкім і блізкім — немагчыма ахапіць і прадбачыць палітычнай рэчаіснасьці. Як бы скептычна ні ставіліся «жорсткія» палітолягі да ўсёй нібыта цьмянай і адцягнутай гуманістыкі, ім даводзіцца шукаць тлумачэньні, улоўліваць заканамернасьці, а таксама прадбачыць будучыню менавіта дзякуючы аналізаваньню культуры той ці іншай палітычнай прасторы. Ірына Бугрова была якраз той навукоўкай, якая ня толькі знайшла сваю нішу, маладасьледаваную да яе, але і крытычна, цьвяроза, унікаючы празьмернага рамантызму, глядзела на нашу палітычную мінуўшчыну. Панятак «аўтарытарызм», «аўтарытарная палітычная культура» яна ўжывала ня толькі ў дачыненьні да ўсё яшчэ дзейнага прэзыдэнта Лукашэнкі і ягонай сьвіты, але таксама ў дачыненьні да апазыцыі. Бо, сапраўды, як нам

**Уладзіслаў Гарбацкі** — сацыёляг, выкладнік акадэмічнага дэпартамэнту сацыяльных і палітычных навук Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту ў Вільні. Летась пераклаў з францускай на беларускую кнігу Эрыка Нёвё «Сацыялёгія сацыяльных рухаў» (Вільня—Менск: Прапілеі, 2010).

стаць усім раптам дэмакратычнымі, калі мы ўсе выйшлі са змрочнага, дэспатычнага ўчора?

Ірына Бугрова ў сваіх лекцыях, артыкулах, а таксама малавядомай беларускаму чытачу кнізе, што зьявілася ў Нямеччыне, прысьвечанай эвалюцыі палітычнай культуры беларусаў ад ВКЛ да Лукашэнкі, разьвенчвала міты пра «дэмакратычнасьць» Беларусі як падчас ВКЛ, як падчас бурлівай дзейнасьці Віленскага ўнівэрсітэту, так і ў пазьнейшыя часы. Яна сьмела адкідвала смачныя міты наконт нібыта «дэмакратычнасьці» шляхты, затым філяматаў зь філярэтамі, указваючы на аднабаковасьць, цьмянасьць, фаталізм, богазалежнасьць іх памкненьняў і каштоўнасьцяў. Апазыцыйнасьць для яе не азначала дэмакратычнасьць. Яна выразна выказвалася наконт абмежаванасьці як эліты афіцыйнай, так і апазыцыйнай, хворай на звычайныя расізм, мізагінію ці гамафобію. Элітаў, якім проста на хапае адукаванасьці, культуры, здольнасьці дасягаць кампрамісу і адкрытасьці — а бязь іх немагчымая пабудова дэмакратычнай палітычнай культуры. Людзі не нараджаюцца носьбітамі дэмакратычнай культуры, а становяцца імі ў працэсе безупыннай адукацыі і пошуку кампрамісу.

Можна бясконца гаварыць пра Ірыну Бугрову-выкладніцу, кіраўніцу навуковых працаў на франка-беларускім факультэце ЭГУ. Зразумела адно: яна прыцягвала многіх — як сваёй непаўторнай зграбнасьцю, так і крытычнымі, а яшчэ багатымі на гумар лекцыямі. Дзякуючы ёй паліталёгія магла быць вельмі вясёлай. Якраз праз шматлікія палітычныя гісторыі, анэкдоты, расказаныя на яе лецыях, жывей успрымалася, а галоўнае, сапраўды, суадносілася з рэчаснасьцю сама дысцыпліна «Палітычная культура». Бо менавіта разнастайнасьць палітычнага гумару, анэкдотаў пра Лукашэнку ў Менску і лукашанятаў у правінцыі, пра мэраў, а таксама пра апазыцыю адлюстроўвае стан палітычнай культуры, часам лепей за любы аналіз вылучае і азначае тую ці іншую зьяву.

Ці не адзіная «культурная» паліталягіня ў Беларусі, Ірына Бугрова ніколі не заставалася кабінэтнай спэцыялісткай. Дзякуючы супрацы з НДА яна была заўжды ў строме часу. Лекцыі, дарэчы, пачыналіся ня толькі з гісторыек, але абавязкова з аналізу чарговага новага палітычнага артыкула.

2011 — гэта стратны год для беларускай палітычнай навукі. Усьлед да В. Сіліцкім і С. Навумавай мы згубілі яшчэ адну адметную паліталягіню. Сумнае завяршэньне цяжкага году. Нам застаецца спадзявацца хіба на тое, што гэтыя неапісальныя і неацэнныя страты і выпрабаваньні скансалідуюць паліталягічны лягер Беларусі — апошнім часам такі раскіданы і дэмаралізаваны.